НАШАМУ КАСТРЫЧНІКУ — 40 ГОД

Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 26 (304) СЕРАДА, 6 лістапада Цана 20 кап.

ДА КОМУНІЗМА!

40 год назад магутнымі залпамі «Авроры» было абвешчана нараджэнне новага свету. Вялікі Кастрычнік з'явіўся самай велічнай датай у гісторыі ўсяго чалавецтва. Ён кінуў выклік старому свету эксплуатацыі, прыгнёту і маны, ён паказаў працоўным усяго зямнога шара рэальны шлях вызвалення ад капіталістычнага рабства.

Калі 40 год назад над светам пранеслася вестка аб пераможным шэсці социялістычнай рэволюцыі у Расіі, слугі капіталу аж захліпаліся, прарочачы хуткую і непазбежную пагібель рабоча-сялянскай дзяржавы. Яны крычалі аб тым, што рабочыя і сяляне, ды яшчэ ў такой адсталай краіне, як Расія, не змогуць утрымацца ля руля дзяржаўнага кіраўніцтва, не змогуць будаваць социялізм.

Сёння, калі магутная совецкая дзяржава у росквіце творчых сіл адзначае сваё сарокагоддзе, калі па шляху социялізма упэўненым крокам ідзе шасцісотмільённы кітайскі народ, ідуць працоўныя краін народнай дэмакратыі, ніхто, вядома, не адважваецца выцягнуць на белы свет дауно памёршую рэакцыйную легенду аб няздольнасці працоўных мас кіраваць дзяржавай і будаваць социялізм.

У гэтыя велічныя гістарычныя дні увесь совецкі народ, увесь многамільённы лагер социялізма, усё прагрэсіўнае чалавецтва падагульняюць вынікі тытанічнай барацьбы, якая пачалася пад сцягам Кастрычніка. У памяці кожнага тыя гераічныя справы, якія ажыццявіў совецкі чалавек за 40 год.

Аглядаючы пройдзены совецкім народам шлях, працоўныя усяго свету з захапленнем гавораць аб першай у свеце атамнай электрастанцыі і балістычнай ракеце, якія створаны у нас, аб спадарожніках Зямлі, якія праносяцца вакол Зямлі і у вобласку якіх людзі усяго свету бачаць славу совецкай краіны.

Але асуджаны гісторыяй на пагібель стары капіталістычны свет ні на хвіліну не спыняе лютай, зацятай барацьбы супроць свету социялізма. Ён рыхтуе танкі, гарматы і самалёты, атамныя і вадародныя бомбы. Ён у сваіх брудных мэтах вылівае патокі хлусні на социялістычны лад, на нашых людзей, на усё, што для нас дорага і свяшчэнна. Але ідэолагі старога свету не у сілах схаваць прауду аб свеце социялізма, народжаным Вялікім Кастрычнікам. Няспынна растуць рады прыхільнікаў і прыяцеляў нашай краіны. Простыя людзі усяго свету бачаць: барацьба Совецкага Саюза за мір, мірнае суіснаванне і эканамічнае спаборніцтва дзяржаў з рознымі грамадскімі сістэмамі поунасцю адпавядае іх імкненням і спадзяванням.

Ідэі Кастрычніка, ідэі марксізма-ленінізма заваявалі сэрцы многіх соцень мільёнаў людзей на Зямлі. З кожным годам мацнее вера працоўных у перамогу комунізма.

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР

У Палацы культуры профсаюзаў адбыўся агульнаўніверсітэцкі вечар, прысвечаны 40-годдзю Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Цёплым прывітальным словам урачыстае паседжанне адкрыў рэктар універсітэта прафесар А. Н. СЕЎЧАНКА. З дакладам аб 40-годдзі Кастрычніка выступіў дацэнт Ф. П. ШМЫГАЎ. У заключэнне вечара сіламі мастацкай самадзейнасці БДУ быў дан вялікі святочны канцэрт.

НОВАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ

Каштоўны падарунак да сарокагоддзя Кастрычніка атрымалі студэнты і супрацоўнікі хімічнага факультэта—адкрыта новая радыёфізічная лабараторыя. Створана яна з мэтай вывучэння радыёактыуных рэчываў. Вучоныя факультэта будуць працаваць над паглыбленнем выкарыстання гэтых рэчываў у нашым жыцці.

Лабараторыя абсталявана навейшымі прыборамі. Кіраваць ёй будзе загадчык кафедры фізічнай хіміі прафесар М. М. Паўлючэнка.

Юбілейнае выданне

У выдавецтве БДУ выйшла у свет багата ілюстраваная кніга В. Г. Івашына «Вялікі Кастрычнік у Мінску».

У кнізе паказваецца, як перамагла Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя у Мінску, як Мінская арганізацыя большэвікоў кіравала гераічнай барацьбой працоўных мас за перамогу улады Советаў.

В. ІСТРОЎ.



НАВУКОВЫЯ КАНФЕРЭНЦЫІ

З 31 кастрычніка па 5 лістапада праходзіла агульнаўніверсітэцкая юбілейная навуковая сесія, прысвечаная саракагоддзю Кастрычніка. На пленарных і секцыйных паседжаннях быў заслуханы і абмеркаваны рад навуковых дакладаў, у тым ліку: «Значэнне Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі для прагрэсу чалавечага грамадства», «Гістарычная перамога марксісцка-ленінскага светапогляду», «Дасягненні фізічных навук за 40 год» і іншыя.

У гэтыя-ж дні адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная саракагоддзю Вялікага Кастрычніка.

Е. ФЕДАРАЎ.

ПРАЦОЎНАЯ ПЕРАМОГА

Калектыў друкарні нашага універсітэта, стаўшы на працоўную вахту у гонар свята, дабіўся працоўнай перамогі. Вытворчы гадавы план выканан да 31 кастрычніка на 101 працэнт.

Выдавецтва выпусціла да сарокагоддзя Вялікага Кастрычніка «Навуковыя запіскі» і кнігі нашых выкладчыкаў І. І. Саладкова, Л. С. Абецэдарскага, В. Г. Івашына. За дзесяць месяцаў гэтага года тут выпушчана 36 назваў кніг у аб'ёме 335 друкаваных аркушаў.

Выдатных вынікаў дасягнулі многія рабочыя. Майстар пераплётнага цэха І. А. Карп выконвае нормы на 177 працэнтаў, майстар друкарнага цэха З. М. Кофман—на 174 працэнты. Вельмі многае зрабіў, каб наладзіць рытмічную работу выдавецтва, старшы майстар наборнага і лінатыпнага цэхаў І. І. Дземьяновіч. Наборшчыца - лінатыпістка А. Гніліцкая выконвае вытворчы план на 153 працэнты, а вярстальшчыца А. Семашко—на 144 працэнты.

Усяму калектыву рыдасна ўсведамляць, што гэтая перамога атрымана напярэдадні Вялікага Кастрычніка.

І. СТАРАВОЙТАЎ.



Наша гордасць

У нас маецца шмат выдатнікаў вучобы. Чулыя таварышы, добрыя арганізатары, яны актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта.

Ліля Ілына

Выдатніца вучобы, добры арганізатар, чулы таварыш—такой ведаюць Лілю Ілыну яе аднакурснікі.

— Цяпер я займаюся на IV курсе біфака, — гаворыць Ліля,—прымаю удзел у рабоце навуковага студэнцкага гуртка гідрабіялогіі. Тут я падрыхтавала даклад «Фармаванне фаун водасховішчаў», з якім выступлю на навуковай канферэнцыі СНТ, прысвечанай сарокагоддзю Вялікага Кастрычніка. Люблю мастацкую самадзейнасць, спорт.

Клім Кожан

1939 год. Над Заходняй Беларуссю узыйшло новае сонца.

— Вучыся, сынок, навёрствай тое, што не ўдалося твайму бацьку, — часта гаварыў Арсень Францавіч свайму сыну.

— Тое, аб чым марыў мой бацька, здзейснілася пры Совецкай уладзе. Мая сястра заканчвае педвучыліша, брат вучыцца у школе. Шчаслівае мае жыццё: я стаў членам Комуністычнай партыі. Мне адкрыты усе шляхі у будучае.

Ларыса Лаўрыновіч

— Я дала сабе слова вучыцца толькі выдатна,—гаворыць Ларыса.—Непарушным правілам з'яўляецца для мяне мой распарадак дня. Дзякуючы яму, я знаходжу час добра падрыхтавацца да семінарскіх і практычных заняткаў, удзяліць час грамадскай рабоце, а таксама добра адпачыць.

Уладзіслаў Кручкоў

Аднакурснікам Уладзіслава Кручкова цяжка успомніць семінар або практычныя заняткі, на якіх ён не быў-бы добра падрыхтаваным. Слава вывучае працы Плеханава, Крупскай, Чэрнышэўскага.

Комсамольскія і грамадскія даручэнні ён выконвае таксама добрасумленна, з такім-жа захапленнем, з якім чытае любімыя кнігі.

Маргарыта Табула

Маргарыта Табула—студэнтка III курса хімічнага факультэта. Выдатніца вучобы за студэнцкім сталом, сумленная працаўніца на цалінных палях, добры арганізатар — так ахарактарызавалі Маргарыту ў дэканаце.

Сама-ж Рыта гаворыць:

— Няхай мае поспехі у вучобе і працы будуць падарункам Вялікаму Кастрычніку.

Гэтых дзён не змоўкне слава!

Гэта старонка прысвечана гісторыі барацьбы за Совецкую ўладу, за справу, дзеля якой звяршылася Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя.

Юнакі і дзяўчаты! Не забывайце аб тым, што шчасце, здабытае ў Кастрычніку, трэба умець адстайваць і абараняць так, як гэта рабілі нашы бацькі і старэйшыя браты і сёстры.

КАСТРЫЧНІК

Над Нявой грымела «Аврора»,
А у нас было усё прасцей:
Суха лязгнулі ноччу затворы,
Факел бліснуў ля панскіх сцен.
Трэснуў стрэл у цішы халоднай,
Стаў на царскі партрэт абцас.
Палахліва святы угодник
З чорнай сценкі глядзеў на нас.
Сэрцы бабак старых адміралі,
Калі гэтай-жа ноччу ўсе
Мы сваёю рукой амяралі
З панскіх гоняў сабе пакрысе.
Сцяг гарэў над нашай гурбою,
Грэлі цвёрдыя пальцы куркі.
І у сасоннику за гарою
Цела пана шукалі ваўкі...
А далёка ад нас на Зімні
Беглі штурмам нашы браты
Загаралася неба Украіны
І займаўся дзень залаты.

Г. БУРАЎКІН.

ЛЯ ДЗОТА

Зямлю вакол ірвалі сотні мін,
А дзот свінцом ссякаў усё жывое.
Ды раптам змоўк, прыціснуты грудзьмі,
Бо анямеў ад смеласці героя.

...Цяпер тут ціха. У мурагу густым
Цвітуць рамонкі на пагорках нізкіх.
Бярозкі юнай дробныя лісты
Шапочуць над бялюткім абеліскам

І толькі з дзота сырасцю дыхне
Ад сцен цвілых і ужо ад часу бурых,
Да болю мне напомніць аб вайне,
Нібы прывід, сляпая амбразура.

Здаецца, бачу, як курыць трава,
І зноў дзот сее смерць на полі боя...
Дауно пара яго-б ужо узарваць,
Шкада трывожыць толькі сон героя.

С. БЛАТУН.

У ПАМЯЦІ ЖЫВЫХ

... Дваццацітрохгадовым юнаком закончыў у 1930 годзе Анастас Вязовіч БДУ. Пасля некалькіх год работы у медыцынскім інстытуце ён вярнуўся працаваць у БДУ у якасці асістэнта на кафедру пазванковых. Па-ранейшаму А. В. Вязовіч прымаў актыўны удзел у грамадскім жыцці універсітэта, быў некаторы час намеснікам дэкана. Але асноўную увагу ён, безумоўна, удзяляў навукова-даследчай і педагагічнай рабоце. А. В. Вязовіч заканчваў працу над дысертацыяй. Ужо было сабрана многа цікавага і каштоунага матэрыяла. Але перашкодзіла вайна. Яна застала А. В. Вязовіча па дарозе дамоў з Белавежскай пушчы, куды ён разам са студэнтамі ездзіў на экскурсію. Толькі 23 чэрвеня ён вярнуўся у родны Мінск. Эвакуіравацца па розных абставінах было нельга і А. В. Вязовіч застауся у Мінску разам з дацэнтам Зубковічам, аспіранткай Завістовіч, прафесарам Палежаевым, які потым быў перапраўлен праз лінію фронта, і іншымі супрацоунікамі БДУ.

Пачалося жыццё, поунае цяжкіх выпрабаванняў, пакут і нястач. Але не згасла вера у перамогу. Яна дапамагала жыць, змагацца...

У той час, калі Мінск быў ахоплен полымем пажарау, А. В. Вязовіч і яго сябры думалі аб тым, як выратаваць ад агню заалагічны музей, бібліятэку і іншыя каштоунасці. Фашысты хадзілі па вулцах Мінска, а Вязовіч, Зубковіч, Завістовіч, Ціток, Доунар пры садзеянні прафесара Палежаева большую частку кніг, экспанатау, архіу перавезлі у дом па вуліцы Віцебскай.

Патрэбна было многа маральнай і фізічнай сілы, каб у акружэнні ворага захаваць перавезеныя каштоунасці. Вялікая заслуга у гэтым належыць Анастасу Васільевічу Вязовічу, умеламу арганізатару. Гэта з яго дапамогай была усганоулена сувязь з партызанскім атрадам «Артур». Разам з Яугенам Зубковічам і Зінаідай Завістовіч ён быў сувязным гэтага атрада. Увайшоушы у давер'е да мясцовых нямецкіх улад, А. В. Вязовіч дабываў у іх многа каштоуных звестак, якія потым перадаваў партызанам. Ішла нябачная, поуная небяспекі, але свяшчэнная барацьба з ворагам. Ні на адну хвілну не згасла вера у перамогу. Але убачыць яе ім не давялося. 26 чэрвеня 1944 года Я. Зубковіча, З. Завітовіч і Вязовіча забрала гестапа. Толькі пасля вайны стала вядома, што у рукі фашыстау трапілі спісы сувязных. У гэтых спісах і былі прозвішчы расстрэляных потым супрацоунікаў нашага універсітэта.

І. ШУЦІК.

Старыя комуністы расказваюць

На X з'ездзе партыі

Уладзімір Антонавіч Тамашэвіч сустрэў Кастрычніцкую рэволюцыю 18-гадовым юнаком. Ён прайшоў складаны жыццёвы шлях ад вучня-наборшчыка да вучонага. Зараз ён загадчык кафедры палітэканоміі БДУ.

У пачатку 1918 года ён паступіў добраахвотнікам у III артылерыйскі Смаленскі дывізіён Чырвонай Арміі. Тут-жа быў прыняты ў рады РКП(б).

У 1921 годзе У. А. Тамашэвіч прысутнічаў на X з'ездзе партыі.

Уладзімір Антонавіч успамінае:

— X з'езд партыі адкрыўся 8 сакавіка 1921 года. Я тады вучыўся у Маскоўскім універсітэце. Члены універсітэцкага парткома былі запрошаны на з'езд, і я, як член парткома, меў магчымасць прысутнічаць на ім.

На з'ездзе, як вядома, Ленін выступаў двойчы: з дакладам аб адзінстве партыі і аб замене продразвёрсткі продналогам. Тады я упершыню бачыў і слухаў Владзіміра Ільіча. Яго выступленні зрабілі на мяне, вялікае ўражанне. Радавала, паражала лагічнасць яго суджэнняў, абгрунтаванасць усіх палажэнняў. Многае з таго, што я ранен не ведаў, або не разумеў, гэтыя даклады мне растлумачылі, яны значна пашырылі мой кругагляд.

У час перапынку у фае я яшчэ раз, ужо зусім блізка, убачыў Леніна. Ён стаяў сярод дэлегатау і проста гутарыў з імі.

Запамяталася мне на з'ездзе вельмі важная акалічнасць. Прэзідыум унёс прапанову аб добраахвотнай паездцы усіх дэлегатау з'езда на падаўленне Кранштацкага мяцежу, які разгарэўся у час работы з'езда. Удзельнікі адзінадушна падняліся і апладыравалі гэтай прапанове. Потым асноуная маса дэлегатау на чале з К. Е. Варашылавым накіравалася у Кранштат.

На жаль, мне больш не давялося бачыць і чуць Владзіміра Ільіча, але глыбокія і незабыуныя ўражанні аб X з'ездзе, аб ленінскіх выступленнях я беражна захаваў на усё жыццё.

Просты і мудры

Неафіт Ермалаевіч Рагозін — комсамолец з 1918 года і член КПСС з 1920— быў удзельнікам рэволюцыйных падзей 1917 года, пазней змагаўся у радах Чырвонай Арміі за Совецкую ўладу.

Зараз ён працуе ў нашым універсітэце загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі.

Вось што расказаў Неафіт Ермалаевіч:

У пачатку красавіка 1918 года мяне і майго сябра Мішу Дзімітрыева паслалі у Маскву за абмундзіраваннем. Сярод шматлікіх пажаданняў у дарогу, памятаю, нас прасілі абавязкова пабачыцца з Леніным і потым расказаць аб усім у палку. Мы не маглі вярнуцца, не выканаушы просьбы таварышоу. У Маскве, у адзін з выхадных дзён, мы адправіліся у Сакольнікі; нам сказалі, што там часта бывае Владзімір Ільіч. Як зараз памятаю: падыйшоу чорны адкрыты аутамабіль. Ён спыніуся непадалёку ад нас. З машыны вышау В. І. Ленін. Владзімір Ільіч сеў на лауку, і хутка вакол яго сабралися дзеці. Відаць, яны ужо дауно сталі добрымі знаёмымі. Дзеці бегалі вакол Леніна, хапалі за рукі, наперабой тармашылі яго. Мы глядзелі на гэта з захапленнем. Ленін кончыу гпраць з дзецьмі і падыйшоу да групы людзей, якія стаялі побач. Ён стау гаварыць аб маленькіх грамадзянах краіны Советау.

У Сакольніках разам з намі было многа юнакоу і дзяўчат, якія, як і мы, прыйшлі пабачыцца з Леніным. Мы з Мішам прайшлі каля Ільіча, узяушы пад казырок, па-ваеннаму чакаючы крок. Вочы Владзіміра Ільіча з цёплай усмешкай спыніліся на нас, ён выпраміуся і таксама узяу пад казырок.

Калі мы вярнуліся ў часць, нам многа разоу прыходзілася расказваць пра гэтыя незабыуныя мінуты.

Давялося мне бачыць і слухаць В. І. Леніна і у вялікіх аудыторыях, пры вялікім наплыве людзей. Адзеты ён заусёды быу проста, трымауся у аудыторыі свабодна і натуральна. Сваёй манерай паводзін ён выклікау прыхільнасць да сябе усіх прысутных.

І я па гэтых сустрэчах на усё жыццё запомніу вялікага правадыра народа — мудрага і вельмі простага, сардэчнага чалавека.

КАЛІ Я БЫЎ САЛДАТАМ

У радах 30-й Іркуцкай стралковай дывізіі я удзельнічаў у вызваленні Крыма ад белагвардзейцаў.

Падрыхтоука да атакі Чонгарскіх пазіцый і баявыя дзеянні дывізіі па фарсіраванню Сіваша праходзілі у вельмі цяжкіх умовах. У лістападзе незвычайна рана для Поуночнай Таўры устанавілася зімняе надвор'е. Стаялі маразы больш 15 градусау. Не было гарачай стравы і вады. Адчувауся вялікі недахоп у снарадах, патронах і зімнім абмундзіраванні. Нягледзячы на гэта, настрой часта быу бадзёры.

Стаяу кастрычнік 1943 года. Восень уваходзіла у свае правы: ночы станавіліся доугімі і халоднымі; неба усё часцей і часцей зацягвалася хмарамі. Дробны дождж сыпау, як скрозь густое сіта.

У тыя дні камандаванне злучэння паставіла перад чатырма брэсцкімі брыгадамі—«За Радзіму», «Беларусь», імя Чапаева і імя Панамарэнкі — задачу: у азнаменаванне наступаючага кастрычніцкага свята паралізаваць чыгункі і шасейныя дарогі Брэст—Брэст—Баранавічы, Брэст—Пінск, Гродна—Ваукавыск, не даць ворагу падводзіць войскі і боепрыпасы на фронт.

З 4 на 5 лістапада дзяжурныя штабау хутка даносілі загады партызанскім падраздзяленням. З наступленнем вечара групы і атрады вузкімі лясными тропамі, засыпанымі жоута-зялёным лісцем, выходзілі на баявое заданне.

...Падрыуная група Івана Клімчэні узарвала на рацэ Зельвянка мост. На тры дні быу спынен рух паяздоу па гэтай лініі.

... Група партызана «Дзмітрыя» на перагоне Ваукавыск—Зельва узарвала чыгуначны састау з авіябомбамі. Усю ноч з вялікай сілай рваліся бомбы.

...У Ваукавыску, Поразаве, Ружанах і у бліжэйшых вёсках расклеяны лістоукі.

Колькі радасці было у партызан, калі з «Вялікай зямлі» у дзве гадзіны ночы прыляцеу самалёт і скінуу нам зброю і боепрыпасы.

У дзень 7 лістапада вораг маўчаў. Ён не мог апамятацца ад тых ударау, якія

Прарыў пачауся у ноч з 7 на 8 лістапада. Вораг адчаянна супраціуляуся. Але нашы войскі паспяхова пераадолелі усе умацаваныя пазіцыі. К раніцы 12 лістапада дывізія, пераправіушыся на поуднёвы бераг Сіваша, заняла станцыю Таганаш і стала развіваць імклівае наступленне на Джанкой.

Поспех 30 стралковай дывізіі адразу сказауся на ходзе баёу нашых войск ля Ішуньскіх пазіцый. Врангель аддау загад аб адыходзе. Праз некаторы час гэты адыход ператварыуся у панічнае адступленне.

Войскі Поуднёвага фронта выканалі свой абавязак перад Радзімай. Да 16 лістапада 1920 года на усёй тэрыторыі Крыма была устаноулена Совецкая улада.

Як прыемна успамінаць аб гэтым сёння, калі наша краіна адзначае сваё 40-годдзе. Як прыемна сазнаваць, што і я, тады радавы чырвонаармеец, унёс свой уклад у справу вызвалення Радзімы.

А. В. КІРСАНАЎ,
Герой Совецкага Саюза,
загадчык спецкафедры БДУ.

Кастрычнік у партызан

нанеслі яму партызаны напярэдадні. Толькі з боку Ружан паказаліся два танкі, але яны пастаялі і, развярнуушыся, пайшлі назад. Камандаванне узмацніла баявыя заставы і прывяло у поуную гатоунасць атрады і брыгады.

Вечарам, калі з-за лесу выкаціуся поуны месяц, асвятляючы вяршыні дрэу, адбыуся партызанскі баль у гонар Вялікага Кастрычніка. Пасля вячэры на паляне гарэў вялікі касцёр, на усе лады залівалася гармоніка, па паляну выйшлі лепшыя танцоры. Паляна напоупілася гоманам, смехам і топатам. Людзі весяліліся ад усяго сэрца.

Да кастра падыйшоу генерал-маёр Капуста і звярнууся:

— Мінутку, таварышы!

Замоук баян, усе павярнуліся.

— Зараз наш чытальнік-дэкламатар прачытае верш, толькі што написаны паэтэсай Казлоускай, — аб'явіу генерал і ветліва уступіу месца партызану Худзькову. Калі дэкламатар закончыу, раздауся гром апладысментау. З чытаннем сваіх прыпевак выступілі партызаны Малчан і Вярхоускі. Яны трапна і едка высмейвалі Гітлера, яго армію.

Непрыкметна разрасталася і шырылася белая імгла. Баль закончыуся. Партызаны патушылі кастры. Сонная цішыня настала у пушчы. Толькі ў засадах і на пастах пад заснежанымі дрэвамі не спалі партызаны. Яны зорка ахоувалі адпачынак таварышоу.

І. ЗАЗЕКА,
дацэнт БДУ, былы рэдактар партызанскай газеты.

НА ЗДЫМКУ: Рэпрадукцыя з карціны мастака В. П. Судаверхава «За родную Беларусь».

ПА ШЛЯХУ, ПРАКЛАДЗЕНАМУ КАСТРЫЧНІКАМ

* * *

ДЛЯ ЦЯБЕ, МОЛАДЗЬ!

Ужо не адно пакаленне совецкай моладзі атрымала пуцёўку у жыццё ў Беларускім універсітэце. Кожную вясну з радасцю, а часам і смуткам, пакідаюць яго юнакі і дзяўчаты, каб аддаць на карысць Радзіме тое багацце розуму і ведаў, якім яны тут авалодалі.

Марыць паехаць на працу у вёску пасля заканчэння філалагічнага факультэта і Кастусь Цвірка. Да ажыццяўлення яго мары засталося мала часу—ён ужо дыпламант. Мала хто ведае аб тым, што Кастусь вырас без бацькі. Памёр бацька, калі Кастусь быў яшчэ малы. Ды ледзь і сям'я не загінула. Маці, нягледзячы на тое, што засталася з малымі дзецьмі, трымала сувязь з партызанамі. Выгадаваць дзяцей, выхаваць іх дапамагла ёй Совецкая улада. Калі-б гэта здарылася да Вялікага Кастрычніка, не быў-бы Кастусь ва універсітэце. Хто ведае, ці не чакаў бы тады яго лёс Вані Жукава ці панскага Салауя?

А што чакала Аляксандра Царука? Які лёс быў прызначан яму, сыну палітычнага катаржаніна, калі-б у 1939 годзе Заходняя Беларусь не была вызвалена з-пад улады польскіх паноў? Цяпер ён кандыдат гістарычных навук, працуе у нас ва універсітэце.

Пакуты раба у цяжкай працы на паноў і капіталістаў, непісьменнасць, цемра—такім быў лёс працоўнай моладзі да Вялікага Кастрычніка, такім ён цяпер там, дзе пануе капітал.

Грымнулі гарматы «Авроры». І племя маладое, народжанае бурай, з палымянымі сэрцамі пачало дапамагаць Камуністычнай партыі будаваць новы свет, свет соцыялізма. І справы моладзі забыць нельга. Гэта абарона Радзімы і Днепрагэс, Комсамольск-на-Амуры і асваенне цаліны, настойлівая вучоба і праца.

Вялікія магчымасці адкрыў перад моладдзю Кастрычнік. Радзіма зрабіла ўсё для таго, каб наша моладзь выхоўвалася аданай Радзіме, набывала веды, прадукцыйна працавала. Дык як-жа не выкарыстаць гэтых магчымасцей у краіне, дзе ажыццяўляецца ўсеагульнае дзесяцігадовае навучанне, дзе каля 800 вышэйшых навучальных устаноў з колькасцю студэнтаў больш двух мільёнаў.

Калі на Беларусі ў дарэволюцыйны час не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, то цяпер працуе 24 ВНУ, дзе вучыцца больш 50 тысяч студэнтаў. У рэспубліцы на 10 тысяч чалавек насельніцтва у ВНУ вучыцца 64 чалавекі, у той час як у Францыі, напрыклад,—37 чалавек, а ў Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі—толькі 27. У 1913 годзе у Беларусі на сто чалавек насельніцтва была надрукавана толькі адна кніга, а у 1955 годзе ужо 160. У масавых бібліятэках рэспублікі маецца звыш 18 мільёнаў кніг, у 43 разы больш, чым у 1913 годзе.

Наша моладзь карыстаецца вынікамі вялікіх заваёў Кастрычніка. Тут бясплатнае навучанне і стыпендыя, інтэрнат і бібліятэкі, спартыўныя залы і стадыёны, культурны адпачынак і мастацтва, вялікія магчымасці для працы і вучобы. Але так было не заусёды. Наша моладзь павінна даражыць тым, што яна мае, адказваць на вялікія клопаты Радзімы сваёй плённай працай.

Ф. БАРАВІК,
намеснік сакратара парткома БДУ.

Студэнты 4 курса хімічнага факультэта Уладзімір Салдатаў і Ала Кавалеўская праводзяць навуковую працу па аналізу сумесяў нармальных парафінавых вуглевадародаў з дапамогай фізіка-хімічных метадаў. Навуковы кіраўнік—прафесар Г. Л. Старобінец.

НА ЗДЫМКУ: Ала Кавалеўская і Уладзімір Салдатаў у лабараторыі.

ПРЫВІТАННЕ З МАСКВЫ

З дауніх часоў людзі марылі аб шчаслівым жыцці, асветленым праметэевым агнём розуму. Людзі марылі аб такім дні, калі просты чалавек дакажа усяму свету, што «может собственных Платонов и быстрых разумом Невтонов Российская земля рождать».

І гэты дзень прыйшоў. Кастрычнік даў свету сотні і тысячы Праметэяў, адухатвораных палымянай любоўю да людзей. Гэта былі большэвікі. Яны звярнулі шыю двуглаваму арлу самадзяржаўя і ажыццявілі ўсё, аб чым марыу прыгнечаны пролетарый.

Навука стала служыць народу. Школы, тэхнікумы, ВНУ даюць цяпер совецкай дзяржаве сотні і тысячы свядомых будаўнікоу камунізма. Сярод іх пачэснае месца займаюць выпускнікі нашага універсітэта. Пра БДУ можна з поўным правам сказаць, што ён народжаны Кастрычнікам.

З часу яго адкрыцця прайшло 37 год. Беларускі універсітэт сустракае 40 гадавіну Кастрычніка новымі дасягненнямі у навуцы. Аб гэтым сведчаць наступныя лічбы. Калі у 1925 годзе ўсяго 55 чалавек атрымалі дыпломы БДУ, то у 1956 годзе—800, у тым ліку 215 без адрыву ад вытворчасці.

Зараз у сценах універсітэта навучаецца 3130 юнакоў і дзяўчат на стацыянары і 3200—на завочным факультэце. Многія з іх прыйшлі ў навуку з заводаў і фабрык.

А жыццё ідзе. Ператвараецца зямля. Праметэеу агонь розуму азарае ўвесь свет. І у яго полымі мы з радасцю бачым яркія іскры навуковай дзейнасці нашага універсітэта.

НАВУКА—НАРОДУ

Совецкі народ урачыста і з незвычайным палітычным і працоўным уздымам адзначае 40-ую гадавіну найвялікшага у свеце соцыяльнага пераваротy.

Пераутварэнні у СССР, праведзеныя пасля рэволюцыі, сапрауды велічныя. Любы бок матэрыяльнага і духоунага жыцця у Совецкім Саюзе адзначаецца вялікім прагрэсам і росквітам.

Яскравыя перамены адбыліся і у галіне навукі. Яна поунасцю стала на пачэсны шлях служэння інтарэсам працоунага чалавека.

Да рэволюцыі на Беларусі не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, ні аднаго навуковаследчага інстытута. Тым больш, не вялася ніякая работа у галіне фізікі і матэматыкі.

У сучасны момант фізіка-матэматычны факультэт БДУ распалагае шматлікім калектывам высококваліфікаваных спецыялістаў, навуковыя працы якіх карыстаюцца сусветнай вядомасцю. Сярод іх акадэмікі АН БССР М. А. Ельяшэвіч, Н. П. Еругін, В. І. Крылоу, А. Н. Сеучанка, Б. І. Сцяпанаў, Н. Н. Сірата, член-карэспандэнт АН БССР Ф. І. Фёдараў.

На кафедрах факультэта вядзецца інтэнсіуная навуковая праца у галіне люмінісцэнцыі, спектраскапіі, фізікі цвёрдага цела і поуправаднікоў, тэарэтычнай фізікі, дыферэнцыяльных урауненняў, вылічальнай матэматыкі, канструктыўнай тэоры функцый, тэоры функцыян комплекснага пераменнага геаметрыі і інш.

Вучоныя факультэта пастаянна публікуюць артыкулы і манаграфіі. Уздымаецца ўзровень навуковых прац і расшыраецца круг вывучаемых пытанняў.

Хутка растуць маладыя навуковыя кадры, асабліва спецыялісты па оптыцы. У бліжэйшы час у Мінску пачне дзейнічаць вылічальны цэнтр; матэматыкі факультэта будуць не толькі праводзіць тэматычныя даследаванні, але і рашаць у грандыёзных маштабах прыкладныя задачы. На факультэце вядуцца дакладныя назіранні за рухам штучных спадарожнікаў Зямлі. Штогод факультэт дае 150—170 фізікаў і матэматыкаў.

Прыемна ўсведамляць, што жывеш у краіне, якая з'яуляецца носьбітам соцыяльнага і навуковага прагрэсу.

Прафесар
Д. А. СУПРУНЕНКА.

РАЗАМ З КРАІНАЙ

Я нарадзілася у той год, калі на увесь свет прагрымеў гарматны «Авроры» Вялікі Кастрычнік. Я не бачыла старога свету, бо жыццё пачалося з 1917 года. Нялёгкім быў мой шлях. Але па гэтаму шляху я шла і іду поруч з мільёнамі сваіх сяброў, разам са сваёй краінай.

Успамінаю прайшоўшыя гады. Здаецца, саромяцца мне няма чаго. Яны прайшлі у працы і вучобе. Калі я закончыла сямігодку і прыйшла дадому с пасведчаннем, мае бацькі вельмі узрадаваліся: «Вось ты ўжо пісьменная. Цяпер дапамагай нам». А сям'я была вялікая. Бацька працаваў рознарабочым. Мне-ж хацелася вучыцца далей. Даведаўшыся, што у тэхнікумах даюць стыпендыю, я рашыла, што змагу займацца і дапамагаць бацькам. Праз тры гады, пасля заканчэння тэхнікума, паехала працаваць фельдшарам у вёску.

У 1940 годзе, закончыушы вячэрнюю школу, паступіла у БДУ. Партыя і ўрад пакланаціліся, каб і у гады вайны ВНУ не спынялі работы. Я працягвала вучобу у Маскоўскім універсітэце. Цяжка было вучыцца і адначасова працаваць у шпіталі, маючы на руках маленькага сына. Але-ж не лягчэй было маёй краіне. Я старалася не адставаць ад яе.

З 1949 года выкладаю у БДУ. Мне радасна бачыць сённяшняе пакаленне, якому адкрыты усе шляхі.

Калі я паведаміла маці, што мяне просяць написаць артыкул у газету і спытала, што-б яна зрабіла на маім месцы, яна адказала: «Я написала-б так: вялікае дзякуй роднай Совецкай уладзе, якая дала магчымасць маёй дачцы, дачцы батрака, стаць вучоным».

Добра сказала маці!

А. С. ЛАКІЗА,
кандыдат філасофскіх навук.

На II курсе хімфака ідуць практычныя заняткі. Студэнты Л. Патаніна і Л. Назарэнка вучацца вызначаць хімічныя элементы ў растворах.

МАРА СТАЛА ЯВАЙ

Напярэдадні свята наш карэспандэнт наведаў астрафізічную лабараторыю універсітэта па назіранню за спадарожнікамі Зямлі. Загадчык яе А. С. Пахута расказаў:

— Вякамі чалавек марыу аб палёце за межы зямлі, у космас.

Няма чаго і гаварыць, што такая мара не магла быць ажыццёўлена ва ўмовах царскага рэжыму. Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла шляхі для свядомай творчасці вызваленага ад эксплуатацыі чалавека.

Сапрауды патрасаючае уражанне на міравую грамадскасць аказаў запуск першых у свеце совецкіх штучных спадарожнікаў Зямлі. З дапамогай прыбораў, якія размешчаны у спадарожніках, будзе рашацца цэлы комплекс пытанняў, адносячыхся да геафізікі верхніх пластоу атмасферы.

Наступным этапам, над якім працуюць совецкія вучоныя, з'явіцца запуск спадарожніка, які зможа вярнуцца на Зямлю.

Студэнты нашага універсітэта на працягу месяца вядуць назіранні за рухам спадарожнікаў. У іх распараджэнні 30 астранамічных трубак і 20 марскіх бінокляў, прыёмнік, магнітафон, секундамер і іншае абсталяванне.

У выніку назіранняу нам удалося некалькі разоў заўважыць спадарожнік. зняць больш 20 каардынатау яго руху. Вынікі адразу адпраўляюцца на цэнтральную станцыю у Маскву.

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

За пасляваенны перыяд універсітэт падрыхтаваў 12 доктараў навук і звыш 200 кандыдатаў навук.

* * *

Ва універсітэце існуе 45 кафедр, на якіх працуе 306 навуковых супрацоўнікаў.

* * *

У 66 гуртках СНТ вядуць навуковую працу звыш 1000 студэнтаў.

* * *

Ганаровыя выпускнікі універсітэта:

Лаурэат Сталінскай прэміі віцэ-прэзідэнт АН БССР. К. Крапіва, акадэмік П. Глебка, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР П. Броўка.

Заслужаныя настаўнікі БССР: А. Кац (выпуск 1925 года), А. Севернева (выпуск 1928 г.), Ф. Раманюк (выпуск 1937 г.), Р. Бараш (выпуск 1930 г.).

* * *

За 1947—1957 гг. на хімфаку праведзена 10 падагульняючых навуковых і дзве навукова-метадычныя сесіі, на якіх зроблена і абмеркавана звыш 100 дакладаў. Акрамя гэтага, вучоныя факультэта зрабілі звыш 20 дакладаў на ўсесаюзных навуковых з'ездах, канферэнцыях і нарадах.

* * *

За перыяд з 1947 года па сучасны момант падрыхтавана спецыялістаў з юрыдычнай адукацыяй 2557 чалавек.

* * *

У 1944 годзе па рашэнню кіруючых партыйных органаў была пачата падрыхтоўка журналістаў.

Выпускнікі аддзялення журналістыкі працуюць у газетах «Звязда», «Советская Белоруссия», «Колхозная правда», «Знамя юности», «Чырвоная змена», «Зорька», «Піонер Беларусі»; у часопісах «Полымя», «Беларусь», «Маладосць», у БЕЛТА, у розных гарадах і вёсках краіны.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

—Мая мара ажыццёўлена

Не заусёды бывае так, што мара, нават самая запаветная, ажыццяўляецца адразу. Часта прыходзіцца шмат перажыць, пераадолець перашкод, каб дасягнуць яе.

Так было і з Нікалаем Мішыным, студэнтам I курса юрыдычнага факультэта. Сяроднюю школу закончыў Нікалай яшчэ у 1953 годзе. Захацелася папрацаваць. Ён паступае камбайнёрам у МТС. Затым на працягу трох год служыць у арміі. Але ніколі Нікалая не пакідала думка аб паступленні у ВНУ. Вельмі хацелася атрымаць вышэйшую адукацыю. І вось у гэтым годзе Нікалай Мішын стаў студэнтам універсітэта. Ад душы спадабаўся Нікалаю універсітэт, вясёлае студэнцкае жыццё, новыя сябры.

— Збылася мая мара, — гаворыць Нікалай і радасна усміхаецца. — Я асабліва рад таму, што яна збылася у юбілейным годзе, саракавым годзе Совецкай улады.

Зоя ШУЛАКОВА.

Будзем вучыцца па-комсамольску

Два месяцы назад мы сталі студэнтамі. Многія з нас прыйшлі з вытворчасці. Нам прывыкаць да работы не трэба.

Вучэбныя заняткі спалучаем з заняткамі у спартыўных секцыях, навукова-даследчых і абарончых гуртках, актыўна удзельнічаем у калектывах мастацкай самадзейнасці.

Умовы для вучобы і грамадскай работы ва універсітэце створаны добрыя. Нам вельмі падабаюцца кабінеты, лабараторыі, спартыўныя збудаванні. Радзіма дала нам многае. Мы абяцаем адплаціць за пястомныя клопаты аб нас добрай вучобай, актыўным удзелам у грамадскім жыцці.

Па даручэнню студэнтаў I курса геафака.

Р. ФЕДАРОЎСКАЯ,
Л. БЕЛАНОЎСКАЯ.

СВЯТОЧНАЕ АЖЫЎЛЕННЕ

(ФОТАРЭПАРТАЖ)

Усюды адчуваецца своеасаблівае перадсвяточнае ажыўленне. Кудысьці спяшаюцца пяцікурснікі філалагічнага факультэта Міхаіл Томка і Віктар Рудакоускі. Праз некалькі мінут іх можна было бачыць у піонерскім пакоі 26 чыгуначнай школы, цесна абкружаных вучнямі (здымак 1). У гэтай школе Міша і Віктар праходзяць педпрактыку. Да саракагоддзя Кастрычніка яны падрыхтавалі з піонерамі цікавую гутарку аб Радзіме.

Апусцела звычайна многалюдная чытальная зала (здымак 2). Займаюцца дзесьці другімі справамі яе такія «штатныя» наведвальнікі, як Фадзей Савіцкі і Барыс Сачанка. Парадзела на лекцыях. Лагодней сталі дэканы і перасталі палохаць студэнтаў стыпендыяй.

Шмат работы у камсамольскага і прафсаюзнага актыву факультэтаў. Многае трэба абмеркаваць, аб усім паклапаціцца. У інтэрнаце, што на Бабруйскай, засядаюць філолагі. Усё галоўнае ўжо рашылі. Засталося адно: дазволіць ці не студэнтам танцаваць у пакоі адпачынку у святочныя дні. Па гэтаму пытанню разгарэліся гарачыя спрэчкі (здымак 3). Думкі выказваюцца розныя. Ёсць і такія, што лічаць: трэба ўсё пакінуць так, як было раней. Ды згоды так і не прыйшлі.

На першым курсе біяфака практычныя заняткі. Тут амаль усе студэнты—дзяўчаты. Яны знаёмяцца з будовай мікраскопа, з саставам клеткі чаранка бігоніі. (здымак 4). Але і у лабараторыі адчуваецца святочны настрой. Чамусьці часцей звычайнага студэнткі паглядваюць на гадзіннікі.

Студэнты з Польшчы, якія займаюцца у нашым універсітэце, сабраліся у адным пакоі (здымак 5). Нядаўна яны паслалі віншаванні на Радзіму сваім родным і блізкім, а цяпер абмяркоўваюць, як лепш правесці свята.

А члены рэдкалегіі сатырычнага дадатку «Будзьце знаёмы» ужо заканчваюць выпуск чарговага нумару.

— У гонар свята няхай прабачаць нас пацярпеўшыя,—гаворыць Рыгор Барадулін, акідваючы пільным позіркам трапіна намаляваныя карыкатуры (здымак 6).

Настойліва да некага дазваніваюцца студэнткі Зоя Батурына і Вера Паулоуская. Мабыць, хочуць запрасіць сяброў да сябе у госці, а можа заказаць да свята торт у Белхлебтрэсце. А хутчэй за ўсё турбуюць асабістага сакратара дэканата, каб даведацца ці будзе заутра апошняя лекцыя (здымак 7).

Першакурснікі застаюцца вернымі сваім спрадвечным традыцыям. Яны стараюцца не згубіць дарэмна ніводнай мінуты нават у такія дні і прадбачліва запасаюцца кнігамі у бібліятэцы.

А свята шпарка крочыць у нашы студэнцкія пакоі, усюды адчуваецца яго урачыстае дыханне.

Памаладзелі вучэбныя карпусы і інтэрнаты, упрыгожаныя яркімі плакатамі і транспарантамі, прыгажэй сталі вуліцы і скверы, і нават асенняе сонейка неяк прыветлівей усміхаецца людзям.

Э. ДУНАЕЎСКІ.

РАЗВЕДЧЫЦА

...1943 год. Позняя восень. Ноч. Цішыня. І хоць знешне здаецца замерла усё на Беларусі, людзі ведаюць, што цішыня гэтая змаглівая, насцярожаная, небяспечная. Ведае гэта і партызанка-разведчыца, што прабіраецца лесам да свайго атрада, вяртаючыся з задання. Ёй трэба спяшацца: заутра—7 лістапада, гадавіна Кастрычніцкай рэволюцыі, будзе парад на партызанскім аэрадроме, выстраіцца уся брыгада, прымуць прысягу новыя партызаны, таварыш з Масквы уручыць узнагароды... Вядома, добра стаяць ва урачыстым страі побач з баявымі сябрамі і на момант уявіць сабе, як некалі, да вайны, з кветкамі у руках, шчаслівай ад песень, ад захаплення, ад усеагульнай весялосці бегла у школу. А потым слухаць суровую прамову камісара і адчуваць, як закіпаюць у сэрцы несціханы боль і крыўда, як рука мацней сціскае зброю.

Толькі не адно гэтае жаданне падганяе дзяўчыну, прымушае крочыць, нягледзячы на страшэнную стомленасць, на дзявочыя жах перад начным лесам і адзіноцтай. Ёй трэба хутчэй паведаміць вынікі разведкі, каб фашысты не змаглі паладзіць для партызанскіх вёсак святкаванне Кастрычніка на свой звярыны лад.

Ужо многія гадзіны яна у дарозе. Не хапае сіл, не ідуць пазбіваныя ногі, ішлі раз невядома, чаму так цёмна навокал, ці гэта ноч такая непраглядная, ці закрылося сама сабою вочы і сон на хаду авалодаў усёй яе істотай. Як хочацца сесці —на хвілінку, на секунду! Але ці-ж можна! І павольна, прыглядаючыся да вядомых толькі ёй прыкметаў, ідзе-брыдзе па нябачанай сцяжыцы дзяўчына. Час бяжыць хутка, а ногі пераступаюць усё павольней. Вось ужо на усходзе распачалася шэрань—прадвеснік позняга восеньскага рання. Ад роспачы і натугі упершыню не вытрымала, першы раз за два гады пасля смерці маці заплакала, не стрымліваючыся і не саромячыся, заплакала падзіцячаму, наўзрыд, парушаючы насцярожаную цішыню леса. Раптам:

— Стой, хто ідзе, пароль?

— Масква, хлопцы.

— Масква.

Таропка праглынуушы камочак, што душыу ля самага горла, падумала: «Як добра, што вы тут».

— Падыходзь, хто такая?

Пад'ехаў на кані хлопец. Пазнала у ім камандзіра аддзялення з першай роты. І хоць не былі яны знаёмы, але ведалі адзін аднаго. Нечаканая сустрэча збянтэжыла на момант абодвух. Дзяўчына выцерла слёзы. Хлапец ведаў, што разведчыцу чакаюць у лагеры, што яна моцна стамілася, бачыу слёзы. Не распытваў, прапанаваў каня. Сам абыдзе пасты пешшу. Яна адказала позіркам, поуным удзячнасці. Узяла каня, села у сядло, якое здалося мяккачэйшым і больш утульным, чым самае мяккае на свеце крэсла. А праз некалькі мінут была у лагеры.

У лагеры устаюць рана. Пакуль развіднее, адгараць начныя кастры на партызанскай кухні, бо у дзень, як магнітам, цягне на дым, што відаць здалёк, ненавісную глазастую самалёт-раму, людзі ідуць на кухню, каб сагрэцца, выпіць гарачага кіпятку, з'есці кавалак хлеба. Ды не да ежы ёй было. Хацелася хутчэй расказаць аб тым, што ведала, убачыць камандзіра, перадаць яму ўсё, што ведала, і ляцець назад, у свой атрад.

Ёй сустрэліся многія. Ішла, не разбіраючы дарогі, не адказваючы на прывітанні, не заўважаючы нікога вакол. Ішла, пакуль не ўбачыла камандзіра. Ён сядзеў на пянёчку, курыў, пра нешта думаў. Ён не адразу заўважыў дзяўчыну, а калі заўважыў, не паверыў сваім вачам. Ён ведаў, што яна пайшла ў разведку, ведаў, што ёй трэба вярнуцца, але не чакаў, што так хутка.

Ён устаў, пайшоў ёй насустрач, і яна, не ў сілах больш трымацца на нагах, упала на яго рукі.

Ён не ведаў, што ў яе ў гэты час балела кожная клетачка, што ў яе ў гэты час ныла кожная жылачка, што ў яе ў гэты час балела кожная рана. Ён не ведаў, што ў яе ў гэты час балела душа. Ён не ведаў, што ў яе ў гэты час балела сэрца. Ён не ведаў, што ў яе ў гэты час балела ўсё.

Ён толькі ведаў, што ў яе ў гэты час не было сіл.

Ён толькі ведаў, што ў яе ў гэты час не было сіл.

Ён толькі ведаў, што ў яе ў гэты час не было сіл